# АД ПАКАЛЕННЯ ДА ПАКАЛЕННЯ…

## ГІСТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ
## АРХІЎНАЙ СПРАВЫ НГАБ у г. ГРОДНА
## (1940-2025 гг.)





**Архівы з'яўляюцца адным з самых каштоўных здабыткаў нашай краіны, яны захоўваюць у сабе багатую гісторыю і культурную спадчыну. Несумненна, гэта адносіцца і да Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродна, які 11 лютага 2025 года адсвяткаваў свой 85-гадовы юбілей. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна - адзін з найбуйнейшых архіваў Беларусі. Яго вядомасць распасціраецца далёка за межы нашай дзяржавы.**

**У сховішчах архіва знаходзіцца 1328 фондаў, у тым ліку больш за 419 тысяч спраў перыяду XIX - пачатку XX стагоддзяў. Акрамя таго, тут захоўваюцца дакументы XVI–XVIII стагоддзяў, многія з якіх уяўляюць сабой каштоўныя помнікі нацыянальнага набытку Беларусі.**

**Архіў захоўвае дакументы, якія адлюстроўваюць палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё ўстаноў і дзеячаў грамадска-палітычнага руху, навукі і культуры Гродзенскай губерні.**

**У 1801 годзе было створана Гродзенскае губернскае праўленне, а ў 1802 годзе быў створаны яго архіў. У архіў былі перададзены актавыя кнігі мясцовых судоў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.**

**За XVI-XVIII стст., а таксама «сконччаныя» справы губернскіх устаноў.**

У 1852 годзе былі заснаваны цэнтральныя архівы для прыёму актавых кніг Заходніх губерняў у Кіеве, Віцебску і Вільні. З архіва Гродзенскага губернскага праўлення былі перададзены ў Віленскі цэнтральны архіў старажытныя актавыя кнігі да 1799 года. Такім чынам, архіў фармаваўся з дакументаў устаноў Гродзенскай губерні XIX ст.
Архіў займаў пакоі ў палацы губернатара і некалькі пакояў у будынку на пл. Тызенгаўза. З 1900 года архіў поўнасцю пераехаў у гэты будынак.

Тэрыторыя Беларусі часта станавілася месцам ваенных дзеянняў, што прыводзіла да знішчэння або вывазу дакументаў у суседнія краіны (напрыклад, у 1812 г. і 1915 г.). Перад акупацыяй Гродна французскімі войскамі архіў губернскага праўлення быў вывезены ў Маскву, Тамбоў і іншыя гарады Расіі. Частка архіва вярнулася назад, а частка згарэла падчас пажару ў Маскве. У Першую сусветную вайну архіў панёс значны ўрон: частка дакументаў была эвакуіравана ўглыб Расіі, і многія з іх засталіся ў расійскіх архівах. Варта падкрэсліць, што дакументальныя матэрыялы па гісторыі Гродзеншчыны захоўваюцца таксама ў архівах Масквы, Санкт-Пецярбурга, Літвы, Польшчы, Украіны.

Гісторыя Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна бярэ свой пачатак з 1940 года пасля рэарганізацыі Гродзенскага архіва ў гістарычны (філіял Цэнтральнага гістарычнага архіва БССР) у выніку далучэння Заходняй Беларусі да Савецкага Саюза.

У 1960 годзе архіў быў пераўтвораны ў Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў (ЦГІА) БССР у г. Гродна, у маі 1993 года - у Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў, у лютым 1995 года – у Нацыянальны гістарычны архіў у г. Гродна, у верасні 1996 года – у Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна.

У 2001 годзе архіў атрымаў назву «Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна». З першых дзён утварэння архіва яго склад стаў папаўняцца новымі дакументальнымі матэрыяламі. Пачынаючы з 1946 года, архіў атрымаў дзясяткі тысяч дакументальных матэрыялаў па сваім профілі за XVI - пачатак XX стст. з архіваў СССР і БССР, з 2000-х гадоў з архіваў ЗАГС Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

# Вехі гісторыі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна (1940-2025)



***Будынак ЦГІА БССР у г. Гродна -1960 г.***



***Калектыўнае фота ў двары архіва, 1952 г.***



***Калектыўнае фота архіва, 1964 г.***



***Супрацоўнікі архіва за працай, 1965 г.***



***Пасяджэнне ЭМК ЦГІА БССР у г. Гродна, 1978 г.***



**Постановление Совета Народных Комиссаров БССР «Об организации архивного дела в Барановичской, Пинской, Вилейской, Брестской и Белостокской областях БССР»**

11 февраля 1940 г.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Обязать Наркомвнудел БССР создать архивные отделения при управлениях НКВД западных областей БССР для руководства архивным делом.

Для концентрации, учета, хранения, приведения в порядок и научной разработки архивных материалов создать в указанных областях областные архивы.

2. Реорганизовать Гродненский архив в исторический архив (филиал Центрального исторического архива БССР).

3. Обязать Наркомфин БССР предусмотреть необходимые средства на оборудование и содержание архивов и архивных отделений западных областей БССР.

- у 1960 годзе архіў быў пераўтвораны ў Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў (ЦГІА) БССР у г. Гродна;
- у маі 1993 года - у Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў;
- у лютым 1995 года - у Нацыянальны гістарычны архіў у г. Гродна;
- у верасні 1996 года - у Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна;
- у 2001 годзе архіў атрымаў назву «Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна».

З 2008 да 2014 гг. праходзіла рэканструкцыя будынка былой сталовай завода «Радыёпрыбор» пад Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. 30 кастрычніка 2014 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё новага будынка па вуліцы Гаспадарчая, 21, у якім і размясціўся Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна.



# Дырэктары архіва

1. Чваноў Лука Іванавіч 1940-1941 гг.
2. Лук'янчанка Аляксандр Мікалаевіч 1944-1945 гг.
3. Давыдава Вера Сафронаўна 1945-1950 гг.
4. Амеліна Зоя Мікалаеўна 1950-1954 гг.
5. Каткоў Аляксей Сяргеевіч 1954-1986 гг.
6. Батракова Карына Пятроўна 1986-2003 гг.
7. Афанасьева Таццяна Юр'еўна 2003-2024 гг.
8. Вянсковіч Аляксандр Браніслававіч 2024- н/час



Каткоў А.С.



Батракова К.П.



Афанасьева Т.Ю.



Вянсковіч А.Б.



## Колькасць фондаў:

**1328 фондаў, 8 калекцый мікрафотакопій (38 фондаў), 419571 адзінак.**

## Храналагічны перыяд:

**XVI - пачатак XX стст., метрычныя кнігі - да пачатку 50-х гг. XX ст.**



## Тэрытарыяльныя адзінкі:

**Беластоцкі, Бельскі, Брэсцкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Кобрынскі, Пружанскі, Слонімскі, Сакольскі паветы Гродзенскай губерні, часткова Вілейскі, Дзісненскі, Лідскі, Ашмянскі паветы Віленскай губерні Расійскай імперыі**

# Структура НГАБ у г. Гродна

**Асноўныя аддзелы:**

- Аддзел уліку дакументаў, інфармацыйна-пошукавых сістэм і аўтаматызаваных архіўных тэхналогій
- Аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў
- Аддзел інфармацыі, публікацыі і выкарыстання дакументаў
- Лабараторыя спецыяльнай апрацоўкі архіўных дакументаў

**Дапаможныя аддзелы:**

- Інжынерна-тэхнічны сектар
- Адміністратыўна-гаспадарчы аддзел
- Бухгалтэрыя











**Працоўны калектыў НГАБ у г. Гродна 2022 г.**




**Працоўны калектыў НГАБ у г. Гродна 2024 г.**

Мы старанна захоўваем традыцыі, закладзеныя нашымі папярэднікамі - архівістамі мінулых гадоў. Рэгулярна публікуюцца артыкулы ў перыядычных выданнях, архівісты удзельнічаюць у тэлеперадачах і канферэнцыях. Акрамя таго, для школьнікаў, студэнтаў і супрацоўнікаў іншых арганізацый праводзяцца экскурсіі, архіўныя ўрокі і лекцыі.



Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна ведаюць не толькі ў Беларусі, але і ў краінах блізкага і далёкага замежжа. Аналіз паказвае, што кожны год у сярэднім архіў апрацоўвае 2150 біяграфічных запытаў, тэматычных і генеалагічных - 75, якія паступілі не толькі з нашай рэспублікі, але блізкага і далёкага замежжа. Чытальная зала абсталявана 15 працоўнымі месцамі, камп'ютарамі і апаратамі для чытання дакументаў на мікрафільмах, сістэмамі аўдыё і відэаназірання. Ва ўмовах новага часу створаны афіцыйны сайт архіва, вядзецца акаўнт у сацыяльнай сетцы «УКантакце», а таксама размяшчаюцца важныя звесткі на старонках сайта «Архівы Беларусі».

Архіў - гэта не толькі выдадзеныя даведкі, захоўванне дакументаў, рэстаўрацыя спраў, навукова-даведачны апарат, экскурсіі і артыкулы. Гэта яшчэ і людзі, якія ў ім працуюць. Калектыў архіўнай установы з поўнай аддачай і прафесіяналізмам імкнецца зрабіць усё магчымае для захавання гістарычнай і культурнай спадчыны нашай дзяржавы.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна - гэта цэлы свет, у якім кожны дакумент, кожны запіс, кожная фатаграфія – гэта кавалачак гісторыі, які можа расказаць будучаму пакаленню аб значных падзеях і дасягненнях, вядомых асобах, традыцыях і культуры мінулых гадоў.

# У ДЗЕНЬ ЮБІЛЕЯ АРХІВА












# У ДЗЕНЬ ЮБІЛЕЯ АРХІВА



***Шаноўныя госці і ветэраны архіўнай службы***